Інклюзіўная адукацыя

# Асобны кабінет для кожнага педагога

## Пасля рэканструкцыі Цэнтр карэкцыйна-развіццёвага навучання ў Брэсце павялічыўся ў тры разы

**Брэсцкаму абласному цэнтру карэкцыйна-развіццёвага навучання і рэабілітацыі сёлета спаўняецца трыццаць гадоў. Да юбілею ўстанова атрымала важкі падарунак — цалкам абноўлены корпус і, адпаведна, магчымасць дапамагаць значна большай колькасці дзяцей.**



— Мы практычна адкрылі новы сучасны аб'ект, — сказаў **намеснік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Вадзім КРАЎЧУК.** — У ходзе капітальнага рамонту будынак не толькі цалкам абноўлены, удалося дасягнуць галоўнага — павялічыць яго плошчу ў тры разы. Цяпер яна складае каля тысячы квадратных метраў. На гэта пайшло каля двух мільёнаў рублёў сродкаў з абласнога бюджэту. Але ж затраты таго вартыя. З'явілася магчымасць павялічыць штат супрацоўнікаў, адпаведна, вырасце колькасць дзяцей, якіх зможа прыняць цэнтр.

**Дырэктар цэнтра Таццяна ЖУК** расказала, што да рэканструкцыі карэкцыйна-педагагічную падтрымку тут атрымлівала ўсяго 30 хлопчыкаў і дзяўчынак, сёння ўжо займаецца 53 дзіцяці, і колькасць будзе расці. «Дзеці, якія патрабуюць асаблівай увагі і асаблівай дапамогі, атрымліваюць яе», — падкрэсліла дырэктар. Акрамя таго, у цэнтры штогод праходзіць псіхолага-педагагічнае абследаванне больш за 300 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Больш як 600 хлопчыкаў і дзяўчынак з вобласці атрымліваюць кансультацыі.

Ва ўстанове з'явіўся шэраг новых кабінетаў. Напрыклад, кабінет дыягностыкі аснашчаны па самых сучасных патрабаваннях. Для кабінета рухальнай актыўнасці набыта новае абсталяванне, ёсць дзве сэнсарныя залы: цёмная і светлая. З'явілася пад'ёмная платформа вертыкальнага перамяшчэння для інвалідаў.

Шматгадовыя напрацоўкі ўстановы паспрыялі адкрыццю рэсурснага цэнтра па інклюзіўнай адукацыі. Асноўнымі мэтамі цэнтра, паводле слоў **намесніка дырэктара Галіны БУСЬКО,** становяцца максімальнае ўключэнне дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ў соцыум, а таксама фарміраванне інклюзіўнай культуры ва ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу, і ў выніку — стварэнне інклюзіўнага грамадства. Цэнтр пастаянна праводзіць інклюзіўныя фестывалі, ладзіць выставы творчых работ сваіх выхаванцаў і іншыя мерапрыемствы.

З улікам названых фактараў і праводзілася рэканструкцыя. Спецыялісты ААТ «Брэстжылпраект» і ААТ «Палессежылбуд» улічылі пажаданні супрацоўнікаў цэнтра. Пры праводзенні аддзелачных работ выкарысталі колеравую гаму, якую хацелі бачыць педагогі.

Што выглядае важным, цяпер у кожнага педагога ёсць асобны кабінет. Апошняе дае магчымасць праводзіць не толькі індывідуальныя заняткі, але і заняткі з невялікімі групамі выхаванцаў. У цэнтры працуе дзіцячы ўрач-псіхіятр, хутка з'явяцца яшчэ некалькі супрацоўнікаў медыцынскага профілю.

Яшчэ адзін набытак, які адзначаюць педагогі, — неабходны дыдактычны матэрыял, развіццёвыя дапаможнікі. Якасць работы спецыялістаў ужо ацанілі і дзеці, і дарослыя. Мама выхаванкі Ала Андрановіч падзякавала і будаўнікам, і работнікам цэнтра: «Сучасныя дзеці павінны займацца ў сучасных умовах, і нашым дзецям яны тут забяспечаны».

**Дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу краіны Марына ВАСЬКО,** якая прыйшла павіншаваць калектыў цэнтра з наваселлем, адзначыла, што капітальны рамонт і рэканструкцыя ўстановы не з'яўляюцца выпадковай падзеяй: «Гэта вынік сацыяльнай палітыкі нашай дзяржавы з улікам падыходаў, якія рэгламентуе Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, дзе шмат увагі ўдзелена інклюзіўнаму кірунку».

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота Аляксандра ШУЛЬГАЧА.**

Інавацыі

## ЗУБНЫЯ ІМПЛАНТЫ: ІНДЫВІДУАЛЬНЫ НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

**Навукоўцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта распрацавалі механіка-матэматычную 3D-мадэль ніжняй сківіцы чалавека для правільнай устаноўкі імплантаў. Імплантацыйнае лячэнне пацыентаў у цяперашні час з'яўляецца распаўсюджаным і самым эфектыўным спосабам аднаўлення зубнога раду.**



Імплант змяшчаецца ў костку сківіцы ў вобласць, дзе раней размяшчаўся корань зуба. Далей ідзе перыяд астэаінтэграцыі, ці зрошчвання, які можа доўжыцца да пяці месяцаў. У гэты момант верагоднае адараванне. Магчымыя наступныя ўскладненні, звязаныя са стратай апорнай здольнасці імпланта. Адной з прычын гэтых праблем з'яўляецца яго некарэктнае размяшчэнне.

Навукоўцы БДУ стварылі механіка-матэматычную 3D-мадэль, якая дазваляе разлічыць дакладнае геаметрычнае размяшчэнне імплантаў з улікам індывідуальных асаблівасцяў пацыента. Гэта спрыяе скарачэнню тэрмінаў лячэння дзякуючы папярэдняму ацэньванню магчымай рэакцыі зубоў на нагрузку.

Для стварэння індывідуальнай мадэлі спачатку робіцца тамаграфічны здымак сківіцы, далей у спецыяльным дадатку для апрацоўкі медыцынскіх малюнкаў 3DSlicer яна праектуецца. Для правядзення вылічальнага эксперымента ўлічваюцца гранічныя ўмовы для сківіцы канкрэтнага чалавека. Гэта дзеянне мышачных сіл і фізіялагічная жавальная нагрузка. Яе велічыня залежыць ад асаблівасцяў прыкусу і цвёрдасці прадуктаў харчавання. Вынікі разліку прадстаўляюцца ў выглядзе дыяграмы, на якой выдзелены вобласці з больш высокім механічным напружаннем і дэфармацыямі.

З дапамогай 3D-мадэлі ўрачы могуць аказваць кансультацыйныя і навукова-тэхнічныя паслугі. Таксама распрацоўка можа быць скарыстана для планавання хірургічных аперацый.

Работа над стварэннем 3D-мадэлі вядзецца з 2020 года. На дадзены момант распрацоўка знаходзіцца на этапе правядзення доследаў.

Праект выконваюць аспірант механіка-матэматычнага факультэта БДУ Дзмітрый Назаранка і дэкан Сяргей Басякоў. Запыт на колькаснае рашэнне задач па ўстаноўцы імплантаў паступіў ад супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта і Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі. Акрамя таго, вучоныя-медыкі праводзілі кансультацыйнае суправаджэнне распрацоўкі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Запрашальнік

## Сезон актыўнага адпачынку пачынаецца з выставы

**З 23 да 26 лютага ў Мінску пройдзе міжнародная спецыялізаваная выстава-кірмаш «Паляванне і рыбалоўства — 2023». Арганізатарам выступае Нацыянальны выставачны цэнтр «БелЭкспа». Выстава праводзіцца пры падтрымцы і ўдзеле Міністэрства лясной гаспадаркі, УП «Белдзяржпаляванне» і Беларускага таварыства паляўнічых і рыбаловаў.**

У рамках праграмы плануецца правядзенне семінараў, прэзентацый і конкурсаў вытворцаў і пастаўшчыкоў тавараў, чэмпіянату вабільшчыкаў аленя, продаж прадукцыі з мяса дзікіх жывёл.

У першы дзень работы выставы будзе праведзена другая міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Сучасныя праблемы паляўнічазнаўства і захавання біяразнастайнасці», якая прысвечана дваццаціпяцігоддзю ўтварэння УП «Белдзяржпаляванне». Падрабязную інфармацыю па ўмовах удзелу ў канферэнцыі можна знайсці на сайце прадпрыемства.

Сёлета выстава суправаджаецца шырокай праграмай: на адкрытай пляцоўцы будзе арганізавана палявая кухня і пройдуць майстар-класы па гатаванні страў з рыбы; на кірмашы фермераў наведвальнікам прапануюць разнастайныя прадукты ўласнай вытворчасці; адбудзецца дэманстрацыя навінак рыбалоўных прылад, майстар-класы па рыбнай лоўлі пройдуць у спецыяльна ўстаноўленых басейнах; будуць праведзены конкурсы і віктарыны з прызамі і падарункамі на стэндах удзельнікаў; наведвальнікаў чакаюць штодзённыя розыгрышы прызоў ад арганізатара выставы.

Таксама ў рамках праграмы плануюцца: дэманстрацыя вопраткі для палявання і рыбалкі; конкурс дзіцячага малюнка на тэму рыбалкі; рэгістрацыя паляўнічых сабак; кансультацыі кінолага; паказ парод паляўнічых сабак; заключэнне дагавораў на паляўнічыя туры; выстава паляўнічых трафеяў; конкурс "Найлепшы паляўнічы трафей года"; продаж пасадачнага матэрыялу.

Экспаненты выставы прапануюць паляўнічыя і рыбалоўныя тавары, паслугі па арганізацыі актыўнага адпачынку, рыбалоўныя і паляўнічыя туры, турыстычныя і спартыўныя тавары, грыбы, ягады, мёд, а таксама спецыяльную літаратуру.

Удзельнікі змогуць пазнаёміць сваю мэтавую аўдыторыю з уласным брэндам і навінкамі, усталяваць дзелавыя кантакты і назіраць рух рынку.

Уваход вольны. Час работы: 23—25 лютага — 10.00—19.00, 26 лютага — 10.00—18.00

Больш падрабязную інфармацыю можна даведацца на афіцыйным сайце арганізатара — Нацыянальнага выставачнага цэнтра «БелЭкспа».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Надвор'е

## Снег і мяцеліца, але...

### на гэтым тыдні ўдзень усё роўна з плюсамі

**Вось і наступіў апошні месяц зімы, час суровых маразоў і завей. На гэтым тыдні нас чакаюць снег, галалёдзіца і начныя маразы, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Паводле інфармацыі сіноптыкаў, у сераду і чацвер кіраваць надвор'ем у нашай краіне будуць франтальныя раздзелы, якія працягнуць прыносіць усё новыя порцыі ападкаў у выглядзе снегу і мокрага снегу.

У першы дзень лютага на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, днём — снегу з дажджом. У асобных раёнах слабая мяцеліца, слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Удзень месцамі ўзмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ўначы панізіцца да 0 — мінус 6 градусаў. Днём будзе ад мінус 2 градусаў да 4 цяпла.



У чацвер часам прагназуецца снег, мокры снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра на працягу сутак будзе ў межах ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

У ноч на пятніцу ў Беларусі яшчэ захаваецца ўплыў атмасферных франтоў, і ападкі ў выглядзе снегу будуць адзначацца ў большасці раёнаў краіны. У светлы час сутак стыхія супакоіцца, але стане халадней. Днём фон атмасфернага ціску пачне расці і снег пройдзе толькі месцамі па краіне. На асобных участках дарог чакаецца галалёдзіца. З паўночна-заходнімі патокамі на тэрыторыю нашай краіны пачне паступаць больш халодная паветраная маса. Тэмпературны фон панізіцца, і ў начныя гадзіны падмарозіць да мінус 1—8 градусаў, а ўдзень слупкі тэрмометраў пакажуць 0—5 марозу.

І ў суботу месцамі па краіне чакаецца снег. На асобных участках дарог галалёдзіца. Уначы тэмпература будзе 3—10 маразоў, пры ўмове працяглых праясненняў месцамі паветра астудзіцца да мінус 11—13 градусаў. Днём прагназуецца ад мінус 6 градусаў да аднаго цяпла.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, уначы да заходніх граніц нашай краіны наблізіцца чарговая сістэма атмасферных франтоў. Раніцай і днём іх уплыў распаўсюдзіцца на большасць раёнаў Беларусі. Таму ноччу месцамі па захадзе, а раніцай і днём на большай частцы тэрыторыі краіны прагназуюцца ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу і дажджу. Месцамі чакаецца слабы галалёд. На асобных участках дарог галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 4—11 градусаў ніжэй за нуль, пры праясненнях да 14 марозу. Днём тэмпература будзе вагацца ад мінус 5 да плюс 2 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні Назаруку Ігару Васільевічу, намесніку міністра замежных спраў, у сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**